# ВЫКАРЫСТАННЕ ТРАДЫЦЫЙНАГА СТРОЮ Ў СЦЭНІЧНЫХ КАСЦЮМАХ ФАЛЬКЛОРНАГА КАЛЕКТЫВУ

**А. М. Шугаеў**
*БГПУ (Беларусь)*

**У артыкуле разглядаецца значэнне і спецыфіка выкарыстання традыцыйнага строю ў сцэнічных касцюмах фальклорнага калектыву.**

*Ключавыя словы*: **традыцыйны строй, сцэнічны касцюм, фальклорны калектыў, народнае адзенне.**

Адзенне – адна з важнейшых частак матэрыяльнай культуры, каштоўная крыніца для даследавання этнічнай гісторыі народа. З'яўляючыся здабыткам нацыянальнай культуры, адзенне адлюстроўвае мастацкія густы, самабытнасць, духоўную спадчыну народа. Народнае адзенне цесна звязана з гісторыяй этнасу, з укладам яго жыцця, а таксама з прыроднымі і сацыяльнымі ўмовамі. Безумоўна, адзенне змяняецца разам з развіццем грамадства, аднак многія элементы з'яўляецца вельмі ўстойлівымі. Гэта традыцыйнасць дазваляе вывучаць адметнасці і ўзаемаўплывы паміж народамі ад старажытнасці да сучаснасці. Сфарміраванае ў выніку доўгіх і складаных працэсаў развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, народнае адзенне вельмі яскрава адлюстроўвае нацыянальную спецыфіку беларусаў, з'яўляецца важнай этнічнай прыкметай.

Беларускае народнае адзенне з'яўлялася прадметам пільнай увагі этнографаў XIX–XXI стагоддзяў (П. Шпілеўскі, А. Кіркор, М. Нікіфароўскі, П. Шэйн, М. Раманюк, М. Кацар, Л. Дучыц і іншыя). Сістэматычнае збіранне этнаграфічных матэрыялаў, у тым ліку і па народнаму адзенню, пачынаецца з часу заснавання Рускага геаграфічнага таварыства (1845 г.). Цікавыя пісьмовыя звесткі аб беларускім народным адзенні даследчыкі знайшлі ў «Статуце ВКЛ» (1588 г.), дзе пералічваюцца тыпы верхняга адзення (сярмягі, футры), галаўныя ўборы (наміткі, вянок) і іншыя [3]. Вывучэнне традыцыйнага адзення ў сучаснасці набывае актуальнасць у сувязі з развіццём беларускай мастацкай творчасці, з папулярызацыяй фальклорна-абрадавых традыцый, з ужываннем элементаў традыцыйнага строю ў сцэнічных касцюмах народных калектываў. Ва ўзорах народнага мастацтва беларусы сцвярджалі свой эстэтычны ідэал, укладвалі трапяткую часцічку душы, светаразумення, тонкі густ і высокае майстэрства. Нацыянальныя вобразы раскрываюць перад намі дзівосны і па-філасофску мудры свет народа – таленавітага, праніклівага творцы. Творы народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ва ўсе часы былі і застаюцца бясспрэчнымі ўзорамі сапраўднага мастацтва, дзейсна ўплываюць на сучасную культуру, на яе далейшае развіццё і ўзбагачэнне [2, с. 3].

Сёння ва ўмовах значнага росту ўзроўню самадзейнага мастацтва вялікая ўвага надаецца стварэнню сцэнічных касцюмаў для народных і аматарскіх калектываў. Касцюм



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з'яўляецца адным з галоўных элементаў, які ўплывае на эмацыянальны настрой гледача. Пры гэтым народны касцюм на сцэне іграе некалькі важных роляў: ён становіцца яскравым і красамоўным сродкам выяўлення ідэі, задумы пастаноўшчыка, ён дазваляе абазначыць геаграфічную і сацыяльную прыналежнасць персанажа, ён стварае мастацкі вобраз калектыву ў цэлым і кожнага ўдзельніка ў прыватнасці. Добры прыклад у гэтых адносінах даюць самадзейныя этнаграфічныя калектывы, якія працуюць у вясковым асяроддзі Беларусі. Яны дэманструюць не толькі высокае выканаўчае майстэрства, але і арганічнае адзінства рэпертуару і касцюмаў выканаўцаў. У сцэнічных касцюмах народных калектываў назіраецца беражлівае захаванне і працяг багатых народных традыцый.

Для носьбітаў фальклору з'яўляецца важным не сам прыём, а абрадавае значэнне прадмета (касцюма). Традыцыі народнага строю шырока выкарыстоўваюцца ў сучасным сцэнічным народным касцюме. Спецыфічнасць прызначэння сцэнічнага касцюма як відовішчнага патрабуе максімальнага набліжэння яго да народных форм. Сцэнічны касцюм павінен адпавядаць народнаму, падкрэсліваць пэўныя этнаграфічныя асаблівасці: тэрытарыяльныя, часавыя, сацыяльныя і г. д. Стваральнік сцэнічнага касцюма павінен даследаваць не толькі матэрыяльную культуру народа, але і пазнаць прыроду будучага вобраза, выкарыстаць народныя формы з вялікім тактам, акуратна і стрымана, не дапусціць вольнага абыходжання з элементамі традыцыйнага адзення, эклектычнае змяшанне, акцэнтаванне нехарактэрных яго рыс.

Умовы сцэнічнага выкарыстання народнага касцюма ў фальклорным калектыве выяўляюць пэўныя патрабаванні: поліфункцыянальнасць, зручнасць пры выкарыстанні на сцэне, выразнасць, дэкаратыўнасць і іншыя. Народныя касцюмы для фальклорнага ансамбля павінны быць разнастайнымі, але падтрымліваць адзіную стылістыку, вырашаць праблемы іх доўгатэрміновага выкарыстання і спалучэння асобных кампанетаў розных касцюмаў. Сярод вялікай разнастайнасці народных сцэнічных касцюмаў можна выдзеліць некалькі асноўных тыпаў:

- сцэнічны касцюм, які ўяўляе сабой рэканструкцыю традыцыйнага строю, узнаўленне першапачатковага выгляду касцюма па візуальных або пісьмовых крыніцах;
- сцэнічны касцюм, які абагульняе асноўныя асаблівасці і каноны традыцыйнага строю;
- сцэнічны касцюм, які стылізуе асноўныя матывы традыцыйнага строю пры дапамозе ўмоўных прыёмаў, спрашчэнняў малюнка і формы, адлюстроўвае агульнапрынятыя ўяўленні пра народнае адзенне.

Эмацыянальна-выразныя асаблівасці касцюма вельмі разнастайныя. За час сваёй гісторыі майстэрства касцюма набыло багаты запас сродкаў і прыёмаў (тэхналагічных і канструктарскіх), якія ствараюць умовы для шырокай эстэтычнай выразнасці. У ліку асноўных можна назваць колер, мастацкія асаблівасці фактуры і пластычныя адметнасці тканін, структурныя прынцыпы кампазіцыі. Акрамя крою і арнаментаў галоўнай задачай пры стварэнні касцюмаў становіцца правільны падбор матэрыялаў, якія павінны адпавядаць аўтэнтычным характарыстыкам і выконваць усе функцыянальныя задачы сцэнічнага выкарыстання.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Стварэнне сцэнічнага касцюма з'яўляецца вельмі важнай задачай для фальклорнага калектыву, паколькі касцюм – гэта першае, што бачыць глядач. Ад прафесійнай каляровай і канструктыўнай пабудовы ўсёй кампазіцыі залежыць першае і наступнае мастацкае ўражанне. Сцэнічны касцюм, даступны для ўспрымання масавага гледача, здольны выступаць дзейсным сродкам мастацка-камунікатыўнага дыялогу традыцыйнага і сучаснага касцюма. Але месца касцюма на сцэне не абмяжоўваецца толькі яго мастацкай значнасцю. Касцюм адлюстроўвае эстэтычныя густы народа, быў і застаецца характэрнай прыкметай свайго часу. Гэта асаблівасць дае магчымасць выкарыстоўваць касцюм на сцэне як сродак, які дапамагае беспамылкова вызначыць месца і час дзеяння. Касцюм дазваляе весці маўклівую «размову» з гледачом, паведаміць пра прыналежнасць чалавека (або калектыву) да пэўнага сацыяльнага або нацыянальнага асяроддзя.

**Літаратура**


1. Бялова, А. А. Беларускі сцэнічны касцюм / А. А. Бялова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 60 с.
2. Раманюк, М. Ф. Беларускае народнае адзенне. Альбом / М. Ф. Раманюк. – Минск : Беларусь, 1981. – 47 с.
3. Цітоў, В. С. Этнаграфічная спадчына : Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура / В. С. Цітоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 2001. – 206 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ